✓**З 1 красавіка ў** зале беларускай літаратуры **Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі** працуе выстава **«Падарожжа скрозь стагоддзі. Замкі Беларусі».** Лепшы спосаб пачаць знаёмства з любой краінай – акунуцца ў яе гісторыю і прайсціся па ключавых месцах старажытнасці, пачуць яе легенды і паданні. А хто ж лепш распавядзе пра падзеі мінулага, як ні замкі Беларусі? Бо яны стагоддзямі назіралі росквіт княжацкіх дынастый і падзенне цэлых дзяржаў, адчынялі свае вароты новым каралям і супрацьстаялі націску бязлітасных заваёўнікаў.

У экспазіцыі прадстаўлены дакументы, што распавядаюць пра самыя вядомыя замкі нашай Радзімы. Сярод іх жамчужыны беларускага краю – Нясвіжскі і Мірскі, палац Пуслоўскіх у Косаве,

шэдэўр архітэктурнага барока і класіцызму Ружанскі замак, адзін з самых вялікіх на беларускіх землях – Лідскі, таксама Любчанскі – апошні з замкавых комплексаў ВКЛ.

Наведвальнікі бібліятэкі маюць магчымасць пазнаёміцца з часопіснымі артыкуламі, матэрыяламі даследаванняў, асобнымі кнігамі, якія раскрываюць развіццё беларускай архітэктуры, уздымаюць пытанні рэстаўрацыі і аднаўлення помнікаў, распавядаюць пра гісторыю ўзнікнення замкаў на тэрыторыі Беларусі і гістарычныя падзеі, звязаныя з імі. У экспазіцыі прадстаўлены кнігі знакамітых архітэктараў, краязнаўцаў, пісьменнікаў – А. Федарука, У. Чантурыі, А. Бутэвіча, М. Ткачова і інш. Асобна можна выдзеліць фотаальбом «Беларусь замкавая» – маштабны праект беларускага кнігавыдання XXI стагоддзя, прысвечаны помнікам манументальнага дойлідства.

Выстава будзе працаваць па 30 мая.


Падарожжа
скрозь стагоддзі
ЗАМКІ
БЕЛАРУСІ